Дырэктару
Брэсцкай абласной бібліятэкі
імя М.Горкага
Данілюк Т.П.

Паважаная Тамара Паўлаўна!
Паважаныя госці ўрачыстай цырымоніі!

Ад імя Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь віншую Вас з нагоды адкрыцця ў Брэсцкай абластной бібліятэцы імя Максіма Горкага сектара рэдкай кнігі!

За больш чым 75-гадовую гісторыю ваша ўстанова пераўтварылася ў сучасны цэнтр па зборы, захаванні і папулярызацыі дасягненняў нацыянальнай і сусветнай культуры. З дапамогай міжбібліятэчнага і міжнароднага бібліятэчнага абанемента бібліятэка прадастаўляе карыстальнікам, у тым ліку і аддаленым, магчымасць доступу да інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк Брэсцкага рэгіёна, краіны і свету.

Сёння фонды бібліятэкі налічваюць больш за 900 тысяч адзінак захоўвання. Мэтанакіравана вядзецца работа па фарміраванні кніжных калекцый. Сярод іх – калекцыя беларускай мастацкай літаратуры, праваслаўная калекцыя, руская калекцыя, калекцыі выданняў на ўкраінскай, польскай, нямецкай, французскай мовах, а таксама калекцыя рэдкіх выданняў, на падставе якой сёння пачынае сваю працу сектар рэдкай кнігі.

Ваша бібліятэка – яскравы прыклад навуковай і выдавецкай дзейнасці, ініцыятар і ўдзельнік шматлікіх доўгатэрміновых праектаў. Сярод вашых пастаянных партнёраў – Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна, Брэсцкае аддзяленне грамадскага аб'яднання “Саюз пісьменнікаў Беларусі”, Рэдакцыйна-выдавецкая установа “Выдавецкі дом “Звязда”, Інстытут імя Гётэ ў Мінску, Расійская нацыянальная бібліятэка ў Санкт-Пецярбургу і інш.

Бібліятэка – адметны сацыякультурны цэнтр рэгіёна. Літаратурныя вечарыны і прэзентацыі кніг, аўтарскія чытанні і фестывалі паэзіі, выязныя выставы, навукова-практычныя канферэнцыі – усе мерапрыемствы па папулярызацыі кнігі і чытання, якія вы праводзіце, прыцягваюць да сябе ўвагу спецыялістаў і шырокай грамадскасці.

Я жадаю ўсім супрацоўнікам Брэсцкай абласной бібліятэкі імя Максіма Горкага і надалей развіваць культурна-асветніцкія традыцыі, плённа працаваць у межах доўгатэрміновых праектаў, пашыраць кола партнёраў, пераўтвараць бібліятэку ў сучасны інфармацыйны, даследчы, навуковы і асветніцкі цэнтр рэгіёна!

Міністр інфармацыі
Рэспублікі Беларусь — Аляксандр Карлюкевіч